**ДУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
# Хроніка
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за сакавік 2019 г.**

## <u>Мерапрыемствы да Міжнароднага жаночага дня</u>

**4 сакавіка**

У час літаратурна-музычнай гасцінай «Вечер изящной поэзии» «Университета золотого возраста» прысутныя пазнаёміліся з біяграфіямі і творчасцю Веранікі Тушновай, Ірыны Снегавай, Рымы Казаковай, Юліі Друнінай, Навэлы Мацвеевай, Бэлы Ахмадулінай і Ларысы Рубальскай. Гучалі песні на словы паэтак. Госці праслухалі выступленне члена народнага аматарскага аб'яднання «Белы бусел» Валянціны Літошык. Цікавасць выклікалі размешчаныя ў Інтэрнэце вершы юных сучасніц Аксаны Мельнікавай і Ірыны Самарынай-Лабірынт.

*(Кобрин-информ, 2019, 14 сакавіка, С.6.)*

ЦРБ, 72 чал.

**6 сакавіка**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры бібліятэкі прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя «Для милых, нежных, дорогих…» для жаночай паловы Беларускага таварыства інвалідаў па зроку.

Старшыня арганізацыі Смехович Валянціна Мікалаеўна звярнулася да прысутных са словамі прывітання, уручыла жанчынам святочныя сувеніры. Канцэртная праграма падрыхтавана сіламі вакальнай групы цэнтральнай раённай бібліятэкі. Мерапрыемства суправаджалася відэапрэзентацыяй «Женщина – музыка, женщина – свет!».

ЦРБ, 38 чал.

**11 сакавіка**

На святочнай конкурсна-гульнявой праграме «Вперед, девчонки!», якая прайшла для навучэнцаў 5 класа, школьнікі чыталі вершы, адказвалі на пытанні віктарыны, прысвечанай жаночай палове чалавецтва. Каманды дзяўчынак «Ванилька» і «Изюминка» ўдзельнічалі ў конкурсах «Кулинарный», «Уроки красоты», «Юная леди», «Молодая мама», «Мир увлечений». У канцы свята хлопчыкі павіншавалі сваіх аднакласніц вясёлымі прыпеўкамі і добрымі падарункамі.

Гарадзецкі філіял, 30 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**1 сакавіка**

Стартаваў конкурс на лепшы чытаючы клас. Дзеці выконваюць розныя конкурсныя заданні, удзельнічаюць у віктарынах, інтэлектуальных гульнях: «Сіла розуму», «Кніжныя спакусы», «Аты-баты, ішлі салдаты» і інш. Вынікі конкурсу будуць падводзіцца ў верасні – у Дзень бібліятэк, а інфармацыю пра пераможцаў можна будзе даведацца на старонках раённай газеты

«Кобрынскі веснік» і на сайце Кобрынскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы.

Залесская ПБ

**11 сакавіка**

Бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і вольнага часу правяла фальклорныя вячоркі «Сустракаем Масленку». Гаспадыня свята пазнаёміла гасцей з назвамі кожнага дня масленічнага тыдня, апісала традыцыі святкавання Масленіцы. Дзеці расказвалі пра тое, як адзначаюць масленіцу ў іх сем'ях. Успаміналі прыказкі і прымаўкі, адгадвалі загадкі, адказвалі на пытанні віктарыны, ўдзельнічалі ў літаратурна-гульнявой праграме «Ух ты, Масленіца!».

Хідрынская ПБ, 22 чал.

**13 сакавіка**

Літаратурна-музычная кампазіцыя «Прошу прощения у всех», падрыхтаваная бібліятэкай сумесна з нядзельнай школай, расказала прысутным пра сэнс свята. Госці прагледзелі тэатралізаванае прадстаўленне і праслухалі праваслаўныя спевы. Са словамі падзякі дзецям і бацькам за працу і з дабраслаўленнем усіх на Вялікі пост выступіў айцец Сергій.

У канцы мерапрыемства адбылося чаяпіцце з традыцыйнымі масленічнымі блінамі.

Залеская ПБ, 70 чал.

**13 сакавіка**

Гадзіна папярэджання «В плену иллюзий…» прайшла для навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа і была накіравана на прафілактыку ўжывання наркатычных сродкаў, фарміраванне навыкаў адказных і бяспечных паводзін. Прафілактычную размову з прысутнымі правёў іерэй Свята-Хрыста-Раждзественскай царквы Андрэй Шаўчук.

Сустрэча завяршылася праглядам фільма пра шкоду наркотыкаў «Предупреждение».

ЦРБ, 54 чал.

**14 сакавіка**

Урок грамадзянскасці «Галоўны дакумент краіны: мінулае і сучаснасць», прысвечаны 25-годдзю з дня прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, пазнаёміў навучэнцаў старэйшых класаў гімназіі г. Кобрына з гісторыяй узнікнення і развіцця канстытуцыйнага права ў рэспубліцы, са структурай Канстытуцыі, яе асноўнымі часткамі, артыкуламі, значэннем Канстытуцыі для дзяржавы ў цэлым і для кожнага грамадзяніна.

Удзел у мерапрыемстве прыняў памочнік пракурора Кобрынскага раёна Ф. С. Ляшок. Увазе гімназістаў была прапанавана відэапрэзентацыя «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь: 25 гадоў здзяйсненняў і пераўтварэнняў».

Работнікі бібліятэкі пазнаёмілі прысутных з выставай «Закон, па якім жыве краіна», з працай публічнага цэнтра прававой інфармацыі. Скарыстаўшыся атрыманымі ведамі, навучэнцы прынялі актыўны ўдзел у віктарыне.

ЦРБ, 86 чал.

**15 сакавіка**

Гадзіна творчага развіцця працаўнікоў сельскіх бібліятэк прайшла пад дэвізам: «Год малой родины: изучаем, предлагаем, внедряем». Галоўны бібліёграф цэнтральнай раённай бібліятэкі прааналізавала краязнаўчыя кніжныя выставы публічных бібліятэк раёна, дала рэкамендацыі па іх удасканаленню. Відэапрэзентацыю па праектнай дзейнасці прадставіла загадчык аддзела маркетынгу. Праведзены аналіз выездаў у публічныя бібліятэкі раёна. Скончылася мерапрыемства кірмашом ідэй «Весенние каникулы в библиотеке».

ЦРБ, 58 чал.

**18 сакавіка**

Гасцямі ўрока здароўя «Не ломай себе жизнь» сталі навучэнцы УА «Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж». Падлеткавы лекар-нарколаг Наталля Леанідаўна Сак расказала пра тое, як лёгка можна трапіць у залежнасць, ужыўшы наркотыкі толькі раз, як у далейшым няпроста вызваліцца ад гэтай згубнай прыхільнасці. У якасці альтэрнатывы прапанавала дзецям займацца спортам, творчасцю, «аддаючы свой голас» за здаровы лад жыцця. Напрыканцы мерапрыемства прысутныя прагледзелі відэаролік «Право на жизнь».

ЦРБ, 68 чал.

**29 сакавіка**

Літаратурная вечарына «Он пел любовь ...», прысвечаная 220-годдзю з дня нараджэння А.С. Пушкіна, адбылася для навучэнцаў старэйшых класаў СШ № 3 г. Кобрына. Вядучыя пазнаёмілі прысутных з любоўнай лірыкай вялікага паэта. Удзельнікі вечарыны ўспаміналі пра сучасніц паэта, якім ён прысвяціў немала сваіх твораў, - Кацярыну Бакуніну, Лізавету Варанцову, Ганну Керн, Кацярыну Ушакову. І, вядома, пра галоўную жанчыну ў жыцці вялікага паэта - Наталлю Ганчарову. Гучалі рамансы, вершы, прысвечаныя каханым Аляксандра Сяргеевіча.

Напрыканцы мерапрыемства прысутныя адказалі на пытанні літаратурнай віктарыны «Все ли мы знаем о А.С. Пушкине?».

ЦРБ, 34 чал.

## Мерапрыемствы ў рамках тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі

**23 сакавіка**

У час правядзення літарурнага свята «С книгой весело шагать» бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з гісторыяй узнікнення свята дзіцячай кнігі «Кніжкіны імяніны", а затым прапанавала сустрэцца з любімымі творамі дзіцячых пісьменнікаў, з героямі казак і апавяданняў. У час гульні дзеці праявілі актыўнасць і адказвалі на пытанні конкурсаў: «Кнігалюбы», «Знаўцы твораў», «Галоўны герой твораў». Скончылася мерапрыемства аглядам кніжнай выставы «Эцюды кніжнага сусвету», а таксама запрашэннем на наступныя мерапрыемствы, прысвечаныя «Кніжкінаму тыдню».

Навасёлкаўская ПБ, 35 чал.

**23 сакавіка**

Удзельнікамі літаратурнага ранішніка сталі вучні Імянінскай сярэдняй школы. У час мерапрыемства дзеці наведалі знаёмыя старонкі самых папулярных дзіцячых кніг, паўдзельнічалі ў літаратурнай віктарыне «З кніжнай сцяжынкі», конкурснай праграме. Лепшыя чытачы атрамалі сувеніры і салодкія падарункі.

Імянінская ПБ, 45 чал.

**23 сакавіка**

Тэвельская публічная бібліятэка правяла для вучняў 1 - 4 класаў Тевельскага дзіцячага саду-пачатковай школы свята кнігі «Торопитесь вы сюда, неделя книги к вам прришла!». Дзеці пазналі гісторыю правядзення Тыдня кнігі, сустрэліся з казачнымі персанажамі, актыўна бралі ўдзел у віктарынах, конкурсах і гульнях. Пераможцы атрымалі салодкія прызы.

Тэвельская ПБ, 38 чал.

**24 сакавіка**

Тэатралізаваным прадстаўленнем «Добры свет любімых кніг» адкрыўся Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі для малодшых наведвальнікаў Батчынскай публічнай інтэграванай бібліятэкі. Дзяцей сустракалі любімыя казачныя героі: Каралева Кніга, Бураціна, Нязнайка, Чырвоны Капялюшык, Баба Яга, Віні-Пух, Паштальён Печкін і інш. Юныя чытачы прынялі актыўны ўдзел у літаратурных конкурсах, віктарынах, гульнях. Самыя актыўныя ўдзельнікі атрымалі дыпломы, медалі «Лепшы чытач», падарункі, а ўсе разам - шмат цікавай і карыснай інфармацыі.

Батчынская ПБ, 85 чал.

*Правядзенне мерапрыемстваў у рамках тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі працягваецца.*

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81